ISSN 0002–354X (print)

## *СОЦИАЛЬНО-ГУМАНИТАРНЫЕ НАУКИ*
### *SOCIAL SCIENCES AND HUMANITIES*

УДК 338.43.02(476)(091)"1953/1964"

Поступило в редакцию 19.10.2016
Received 19.10.2016

**М. У. Смяховіч**

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# АСНОЎНЫЯ КІРУНКІ АГРАРНАЙ ПАЛІТЫКІ СССР 1953–1964 гг. І ВЫНІКІ ЯЕ ВЫКАНАННЯ Ў БССР

*(Прадстаўлена акадэмікам М. П. Касцюком)*

В сообщении сделан вывод, что в 1953–1964 гг. аграрная политика в СССР была направлена на мощный подъем сельского хозяйства, удовлетворение потребительского спроса на продукты питания. Сентябрьский 1953 г. модернизационный проект был рассчитан на экстенсивный путь развития сельского хозяйства. На эту идею опиралось руководство СССР в соперничестве с США в производстве продукции животноводчества на душу населения в 1957–1961 гг., которое Советский Союз проиграл. В период после принятия третьей программы КПСС советская аграрная политика была ориентирована на мощный подъем сельского хозяйства, решение аграрного вопроса, полное удовлетворение потребностей крестьянства. Это требовало придания сельскому хозяйству государственного экономического приоритета, чего не было сделано. Вместе с тем деятельность ЦК КПБ, Совета Министров БССР, белорусской аграрной науки позволила сельскому хозяйству республики выполнить плановые задания семилетки.

Автор сообщения отмечает, что реорганизация системы управления сельской плановой экономикой, которая была проведена в СССР в 1962–1964 гг., была направлена на усиление эффективности и ответственности власти за решение задач, определенных третьей программой КПСС.

*Ключевые слова*: государство, аграрная политика, модернизация сельского хозяйства, плановые задания, семилетка, достижения, реорганизация системы управления.

**M. U. Smiakhovich**

*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Republic of Belarus*

# MAIN DIRECTIONS OF THE USSR AGRICULTURAL POLICY DURING 1953–1964 YEARS AND THE RESULTS OF THEIR IMPLEMENTATION IN THE BSSR

*(Communicated by Academician M. P. Kostyuk)*

The author has come to a conclusion that the agrarian policy in the USSR and the BSSR was directed to a steep growth of agricultural industry, satisfaction of the consumer's food product requirements in 1953–1964 years. The modernization project of September 1953 was prepared for an extensive way of development of agricultural industry. A failed competition between the USSR and the USA in production of livestock production per capita in 1957–1961 years relied on this idea. During the period after the adoption of the third CPSU program, the Soviet agrarian policy has been focused on a powerful rise of agriculture, a solution of an agrarian question, a full satisfaction of the peasantry's needs. This required the state economic priority status for agriculture which was not done. At the same time, the activities and efforts of the Central Committee of the Communist Party of Byelorussia (CC CPB), the BSSR Council of Ministers, and the Belarusian agricultural science allowed the BSSR agricultural industry to carry out the plan targets of the Seven-Year Plan, which facilitated its further development.

The author of the article notes that the reorganization of a control system of the Soviet planned economy, which has been carried out in the USSR in 1962–1964 years, has been aimed at strengthening the efficiency and responsibility of the power for the decision of the tasks determined by the third CPSU program.

*Keywords*: state, agrarian policy, modernization of agricultural industry, plan targets, seven-year plan, achievements, reorganization of system of a management, experience.

© Смяховіч М. У., 2017.

**Уводзіны.** Сельская гаспадарка незалежнай Беларусі ўмела выкарыстоўвае аграпрамысловы патэнцыял, які быў створаны ў папярэдні перыяд. У суверэннай Беларусі сельская гаспадарка – адзін з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі, поспехі ў развіцці беларускага аграпрамысловага комплексу (АПК) відавочныя, але назапашаны гістарычны вопыт патрэбна ўлічваць пад час вырашэння шэрага праблем, якія тармазілі развіццё савецкага АПК. Даследаванне кірункаў аграрнай палітыкі КПСС дае магчымасць адлюстраваць пэўныя дасягненні і праблемы ў вырашэнні аграрнага пытання, забеспячэнні інтарэсаў сялянства.

"Генеральная лінія" КПСС у пытанні развіцця сельскай гаспадаркі не вызначалася разнастайнымі падыходамі. Зацверджаны пяцігадовы план быў законам для адміністрацыйна-ўпраўленчых структур усіх узроўняў. На гэты конт на XXVI з'ездзе КПСС Л. Брэжнеў заявіў: "Партыя заўсёды разглядала план як закон. І не толькі таму, што ён зацвярджаецца Вярхоўным Саветам. План – гэта закон, таму што толькі яго прытрымліванне забяспечвае зладжаную працу ўсёй народнай гаспадаркі. … План, безумоўна, павінен быць рэальным, збалансаваным. Але настолькі ж безумоўна ён павінен і выконвацца" [1, с. 50].

Адной з асноўных мэт пяцігадовых планаў было забеспячэнне інтарэсаў працаўнікоў калгасаў і саўгасаў, найперш у кірунку пераводу аграрнай вытворчасці на індустрыяльны шлях развіцця, стымулявання і аплаты працы, арганізацыі адпачынку і інш. "Усталёўваючы кошты рэалізацыі на прамысловую і сельскагаспадарчую прадукцыю, дзяржава рэгулюе размеркаванне выробленага нацыянальнага прадукту, тэмпы пашыранага ўзнаўлення ў сельскай гаспадарцы, ажыццяўляе стымуляванне сельскагаспадарчай вытворчасці", – адзначаў акадэмік Ф. Марцынкевіч [2, с. 207].

Вывучэнню гісторыі савецкай аграрнай палітыкі ў СССР і БССР прысвяцілі свае працы А. Белязо, М. Багдэнка, Л. Бароўка, А. Бураўскі, В. Венжэр [3], В. Доркін і інш. Гэтае пытанне разглядалася і ў калектыўных шматтомных выданнях: "Гісторыя Беларускай ССР" [4], "Гісторыя Беларусі" [5], "История государства и права Белорусской ССР" [6], "История социалистической экономики СССР" [7]. Аднак у даследаваннях савецкага часу ацэнкі дзяржаўнай аграрнай палітыкі знаходзіліся пад уплывам класава-партыйнага падыходу. Як адзначае акадэмік М. Касцюк, характэрнай асаблівасцю савецкай гістарыяграфіі было тое, што "не спецыялісты-гісторыкі, а ўладныя структуры і іх функцыянеры вызначалі напрамкі распрацовак і ацэнкі гістарычных падзей, падганяючы ўсё гэта пад вырашэнне бягучых і, як ім уяўлялася, перспектыўных ідэалагічных задач" [8].

Асноўнай задачай публікацыі з'яўляецца вызначэнне мэт, кірункаў і асаблівасцей аграрнай палітыкі ў СССР і яе выкананне на тэрыторыі БССР.

**Асноўная частка.** На пачатку 1950-х гадоў знізіліся тэмпы развіцця сельскай гаспадаркі, разлікі з калгаснікамі на працадні праводзіліся нерэгулярна. На 1 студзеня 1953 г. шмат беларускіх калгасаў не разлічыліся за 1952 г., сяляне не атрымалі 149 тыс. т хлеба, 119 тыс. т бульбы, 40 млн руб. грошай [6, с. 185]. Становішча калгаснага сялянства было гаротным.

Савецкая вёска чакала перамен. Яны пачаліся пасля таго, як КПСС узначаліў М. Хрушчоў. У верасні 1953 г. ён склікаў пленум ЦК КПСС, які зацвердзіў падрыхтаваныя мерапрыемствы. З іх дапамогай планавалася ажыццявіць маштабны мадэрнізацыйны праект, да 1962 г. гэта была асноўная мэта савецкай аграрнай палітыкі.

На наш погляд, у любым мадэрнізацыйным працэсе неабходна адрозніваць два кірункі. Першы звязаны з удасканаленнем і абнаўленнем сродкаў вытворчасці – машын, абсталявання, тэхналагічных працэсаў і інш. Другі мадэрнізацыйны пачатак спалучаны з пошукам і ўкараненнем новых форм арганізацыі і аплаты працы, якія стымулююць, да прыкладу, працу сялянства. У канчатковым выніку мэта мадэрнізацыі – павышэнне прадукцыйнасці працы і развіццё вытворчасці, у тым ліку і сельскагаспадарчай [9, с. 375–376].

У верасні 1953 г. было прынята некалькі рашэнняў, якія павінны былі стварыць неабходныя эканамічныя і сацыяльныя перадумовы з тым, каб дамагчыся поспеху ў рэалізацыі мадэрнізацыйнага праекта. Гэта знайшло адлюстраванне ў адпаведных пастановах, якія савецкімі даследчыкамі былі разгледжаны досыць шырока. Таму неабходна звярнуць увагу на прынцыповыя пытанні: на змены ў планаванні і забеспячэнні калгасаў і саўгасаў новымі сродкамі вытворчасці,

мерапрыемствы, накіраваныя на стымуляванне сялянскай працы, практычную дзейнасць дзяржаўнага кіраўніцтва ўсіх узроўняў па выкананні прынятых рашэнняў і вынікі мадэрнізацыйнага працэсу.

У дакладзе на пленуме, характарызуючы становішча ў сельскай гаспадарцы, першы сакратар ЦК КПСС М. Хрушчоў адзначыў, што ў пасляваенны час, каб прадухіліць заняпад калгасаў і саўгасаў, дзяржава не мела магчымасці накіроўваць у сельскую гаспадарку неабходную колькасць матэрыяльна-тэхнічных і фінансавых рэсурсаў. “У нас не было магчымасці забяспечыць адначасовае развіццё высокімі тэмпамі і цяжкай індустрыі, і сельскай гаспадаркі, і лёгкай прамысловасці”, – сказаў М. Хрушчоў [10, с. 11]. Затым ён вызначыў асноўны чыннік правалу сталінскай аграрнай палітыкі. Гэта было парушэнне “прынцыпу матэрыяльнай зацікаўленнасці,… прыроды арцельнай формы калгасаў” [10, с. 11–13], але ў 1958 г. выказаў думку, што гэта былі “памылкі ў кіраўніцтве сельскай гаспадаркай” [11, с. 336]. Яшчэ пазней была зроблена зусім іншая выснова. “Партыя асудзіла па сутнасці антыкалгасную палітыку цэн, якая праводзілася пры жыцці Сталіна. У той час нарыхтоўчыя цэны былі настолькі нізкія, што калгасы не маглі за кошт продажу прадукцыі пакрываць нават вытворчыя затраты. Праца большасці калгаснікаў не аплочвалася”, – заявіў М. Хрушчоў [12, с. 4].

Пасля верасня 1953 г. было вырашана сталінскую антыкалгасную (па сутнасці антысялянскую) палітыку цэнаў, прытым пад лозунгам умацавання саюза рабочых і сялян, выправіць з дапамогай новых кірункаў аграрнай палітыкі. Дзеля ўдасканалення механізма планавання быў зацверджаны пастаянны нарматыў – плошча ў 100 га. Акрамя таго, пад час вызначэння планавых заданняў калгасам і саўгасам органы Дзяржплана СССР, партыйнае і савецкае кіраўніцтва павінны былі ўсебакова ўлічваць эканамічныя і прыродныя фактары, якія ўплывалі на развіццё раслінаводства і жывёлагадоўлі ў кожнай гаспадарцы. Гэты кірунак аграрнай палітыкі вымагаў вырашэння вельмі актуальнай праблемы – спецыялізацыі аграрнай вытворчасці. У 1946–1952 гг. для сталінскага кіраўніцтва тэма спецыялізацыі калгасаў і саўгасаў не была актуальнай. Але ўжо ў 1954 г. у БССР разгарнулася будаўніцтва прадпрыемстваў харчовай і перапрацоўчай прамысловасці, што запатрабавала “прывязкі” сыравіннай базы, да прыкладу, да прадпрыемстваў па перапрацоўцы малака, вытворчасці цукру і інш.

У жніўні 1956 г. рашэннем бюро ЦК КПБ пад старшынствам сакратара ЦК КПБ М. Малініна была створана “Камісія па распрацоўцы мерапрыемстваў па павелічэнні вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі на 100 га зямлі па зонах Беларускай ССР” [13, арк. 195–198]. Да вырашэння праблемы былі прыцягнуты беларускія навукоўцы. У выніку напружанай працы былі складзены 42 картаграмы па прыродна-кліматычных умовах гаспадарання, глебах Беларусі, эканамічным раяніраванні, карысных выкапнях. Гэта дало магчымасць падрыхтаваць мерапрыемствы па тых пытаннях, якія былі неабходны для правядзення тэрытарыяльна-занальнай спецыялізацыі сельскай гаспадаркі рэспублікі. Гэта быў яе першы этап. У 1960 г. міністр сельскай гаспадаркі СССР В. Мацкевіч падкрэсліў: “Цяпер на чарзе пераход да больш паглыбленай спецыялізацыі… асобных гаспадарак па вытворчасці тых ці іншых відаў прадукцыі” [14, с. 9]. Па нашым вызначэнні, у 1962 г. пачаўся другі этап у ажыццяўленні галіновай унутрыгаспадарчай вытворча-тэхналагічнай спецыялізацыі калгасаў і саўгасаў. У сакавіку 1963 г. пленум ЦК КПБ прыняў пастанову “Аб спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі і мерах па паляпшэнні кіраўніцтва калгасамі і саўгасамі”, у якой гаварылася, што БССР павінна быць раёнам інтэнсіўнай мясамалочнай жывёлагадоўлі, свінаводства і птушкагадоўлі [15, с. 433].

Важным кірункам аграрнай палітыкі былі змены ў галіне матэрыяльнага стымулявання сялянскай працы, калі пачалася выплата сялянскіх заробкаў грашовымі сродкамі праз штоквартальную выдачу авансаў (25 % ад налічанага заробку). Рэальную палёгку ад новай палітыкі сяляне адчулі праз тры гады, калі авансавыя выплаты пачалі праводзіць 3,4 тыс. беларускіх калгасаў (66 % да агульнай колькасці), калі абавязковыя штогадовыя пастаўкі мяса з калгаснага падворка скараціліся з 36 да 30 кг (на 16 %), малака – з 220 да 100 кг (на 54,5 %) [6, с. 314]. Яшчэ больш істотныя змены адбыліся ў 1959–1961 гг., калі ў калгасах БССР пачаўся пераход на новую сістэму гаспадарання. У справаздачы камісіі, створанай ЦК КПБ для вывучэння становішча ў калгасах Брэсцкай вобласці, адзначалася, што ў 1959 г. у вобласці на грашовую аплату працы

ўжо перайшло 29 калгасаў. Камісія станоўча ацаніла і рэкамендавала да пашырэння практычны вопыт калгаса “Маладая гвардыя” Брэсцкага раёна, які пачаў будаваць працу паляводаў і жывёлаводаў на аснове гаспадарчага разліку. Разам з тым, камісія прыйшла да высновы, што ў тых калгасах, дзе не ўкараняецца гаспадарчы разлік, у калгаснікаў “няма стымула для павышэння прадукцыйнасці працы” [16, арк. 47]. Дзякуючы намаганням партыйных камітэтаў, спецыялістаў навукова-даследчага Інстытута эканомікі і арганізацыі сельскай гаспадаркі пераход калгасаў на новую сістэму гаспадарання паскорыўся. У дакладной запісцы ЦК КПБ, адрасаванай у ЦК КПСС 4 красавіка 1961 г., першы сакратар ЦК КПБ К. Мазураў і Старшыня Савета Міністраў БССР Ц. Кісялёў паведамлялі, што ў рэспубліцы “вядзецца вялікая праца па ўкараненні гасразліку ў калгасах і саўгасах… Прымаюцца меры па пераводзе на гасразлік усіх аддзяленняў саўгасаў” [17, арк. 184]. Наступным крокам на шляху да ўкаранення гаспадарча-разліковай формы арганізацыі і матывацыі працы калгаснікаў сталі рашэнні XXII з’езда КПСС, які дэклараваў: “Вытворчая дзейнасць кожнага калгаса павінна ажыццяўляцца на аснове гаспадарчага разліку” [18, с. 258]. У дакладной запісцы сакратара Гродзенскага сельскага абкама партыі В. Міцкевіча, якая была адрасавана ў ЦК КПБ, адзначалася, што ў 1964 г. у калгасах вобласці па вопыту калгаса “Прагрэс” Гродзенскага вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення было створана 635 буйных гаспадарча-разліковых вытворчых участкаў (замест 1337 аддзяленняў, паляводчых брыгад і ферманаў), з арганізацыяй у іх складзе 770 механізаваных звёнаў усяго цыкла вытворчасці канечнай прадукцыі ў паляводстве [19, арк. 246]. Такі ж працэс адбываўся і ў іншых абласцях БССР.

Новым кірункам аграрнай палітыкі стала змяншэнне падатковай нагрузкі на калгаснае сялянства, дзеля чаго было вырашана “спісаць” сялянскую запазычанасць мінулых гадоў па абавязковых пастаўках прадуктаў жывёлагадоўлі, знізіць зямельны падатак калгаснікаў, якія не мелі кароў, у 1953 г. на 50 %, у 1954 г. – на 30 % [6, с. 417]. Акрамя таго, былі прыняты рашэнні, скіраваныя на індустрыялізацыю сельскай гаспадаркі. Планавалася ўзмацніць і пашырыць працу па электрыфікацыі калгасаў, саўгасаў і МТС, павялічыць пастаўкі на вёску новай тэхнікі, угнаенняў, абсталявання, спецыялістаў. Дзяржава запланавала ў перыяд з 1954 г. па 1 мая 1957 г. паставіць сельскай гаспадарцы не менш за 500 тыс. трактароў агульнага прызначэння ў 15-сілавым вылічэнні і 250 тыс. фізічных прапашных трактароў [10, с. 57], шмат іншай новай тэхнікі.

У сялянскай рэчаіснасці таго часу рашэнні, якія былі прыняты ў 1953 г., выглядалі незвычайна. Упершыню сяляне пачулі, што ў іх з’явілася права на пастаяннай аснове атрымліваць рэальныя грашовыя сродкі, упершыню дзяржава пачала дапамагаць вясцоўцам весці сваю асабістую гаспадарку. Але больш за іншых хрушчоўскія ініцыятывы падтрымала калгаснае кіраўніцтва, асабліва намер адкінуць практыку навешвання ярлыкоў – “вораг калгаснага ладу”, пагрозы і рэпрэсіі ў адносінах да тых кіраўнікоў, хто не выконваў планавыя заданні і прызвычаіўся расцягваць калгасную маёмасць.

На нашу думку, у 1953 г. вызначэнне М. Хрушчовым асноўнай прычыны правалу сталінскай аграрнай палітыкі было аднабаковым і неглыбокім. Калі сказаць па сутнасці справы, то новае кіраўніцтва ЦК КПСС разлічвала, што дастаткова палегчыць фінансава-падатковую эксплуатацыю сялянства, дэлегаваць калгаснаму кіраўніцтву некаторыя правы, якімі дагэтуль валодала дзяржава, як справы ў сельскай гаспадарцы пойдуць у гару. Надалей жыццёвая практыка засведчыла, што гэтыя разлікі і намаганні далі станоўчы вынік, але ён быў кароткачасовым.

Праз год пасля вераснёўскага пленума ЦК КПСС у мэтах паскарэння развіцця сельскай гаспадаркі, павелічэння вытворчасці збожжа, мяса-малочнай прадукцыі М. Хрушчоў выступіў з ініцыятывай асваення цалінных і абложных зямель у асноўным шляхам будаўніцтва новых саўгасаў. Крытыкі палітыкі М. Хрушчова засяроджвалі ўвагу на тым, што ён зрабіў стаўку на шырокае ўкараненне экстэнсіўных метадаў гаспадарання. Сапраўды, ў 1951–1963 гг. на долю экстэнсіўных фактараў прыходзілася 68,2 % валавага прыросту прадукту савецкай эканомікі [20, с. 305]. Папракалі яго і тым, што ідэя асваення цаліны праводзілася ў жыццё спантанна і жадаемых вынікаў не прынесла. Таму нягоды і нават ахвяры гэтай кампаніі былі марнымі [21, с. 193].

Але і ў першым і ў другім выпадках крытычныя ацэнкі гэтай хрушчоўскай ініцыятывы не былі аб’ектыўнымі. Па-першае, М. Хрушчоў ведаў, што экстэнсіўны метад гаспадарання вы-

карыстоўвалі развітыя капіталістычныя краіны, у тым ліку і ЗША, калі ў гэтай краіне ў 1950-х гадах ішоў працэс пашырэння пасяўных плошчаў. Па-другое, на той час у СССР склалася драматычнае становішча з вытворчасцю хлеба. У 1953 г. у СССР быў нарыхтаваны 31 млн т збожжа, а на харчовыя і гаспадарчыя патрэбы расходавана 32 млн т [7, с. 378, 379]. Безумоўна, адзіным адносна хуткім выйсцем для краіны было маштабнае асваенне цалінных і абложных зямель у Казахстане, Сібіры, Паволжы і на Алтаі, якое пачалося ў 1954 г. Некаторыя члены ЦК КПСС – Малянкоў, Молатаў, Кагановіч крытычна ставіліся да гэтай ініцыятывы, але кіраўніцтва Савецкай Беларусі яе падтрымала, з Беларусі на цаліну было адпраўлена каля 60 тыс. чалавек, шмат аўтатрактарнай тэхнікі, іншых рэсурсаў.

У цэлым хрушчоўскія разлікі спраўдзіліся. Эканамічны эфект ад засваення цаліны быў відавочны. Усяго ў СССР у гаспадарчы зварот было ўведзена каля 42 млн га новых зямель, на якіх было створана 425 саўгасаў, сабекошт вытворчасці адной тоны каласавых на цаліне быў амаль у 2 разы ніжэй за сярэдні паказчык па СССР [7, с. 384, 385]. Усяго за 20 гадоў цаліна дала краіне каля 31 млрд пудоў хлеба, з іх 15,5 млрд пудоў прыпала на Казахстан. Вельмі важным быў і іншы эфект. На яго ў гістарычных выданнях амаль не звярталася ўвагі, а менавіта: 1 студзеня 1958 г. гаспадаркі калгаснікаў (калгасныя двары) былі поўнасцю вызвалены ад абавязковых паставак сельскагаспадарчых прадуктаў дзяржаве.

Аднак асваенне цаліны запатрабавала значных фінансавых і матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў. У сувязі з гэтым на калгаснае будаўніцтва ў іншых рэспубліках звярталася менш увагі. Таму ў БССР вынікі выканання заданняў пятай пяцігодкі былі правальнымі. У сярэднім ураджайнасць зерневых за гэтую пяцігодку ў БССР ва ўсіх катэгорыях гаспадарак склала толькі 5 ц/га (замест 17 ц/га), ільну – 2,4 ц/га (замест 4 ц/га), бульбы – каля 100 ц/га (замест 155 ц/га па плане) [22, с. 88, 100, 101]. Толькі па асобных паказчыках (павелічэнне пагалоўя кароў, пашырэнне пасяўной плошчы бульбы) заданні пятай пяцігодкі былі выкананы. М. Хрушчова гэта не задавальняла і ў 1956 г. ён зрабіў кадравыя перастаноўкі, першым сакратаром ЦК КПБ быў абраны К. Мазураў.

У лютым 1956 г. М. Хрушчоў правёў ХХ з’езд КПСС. Разам з іншымі, гэты з’езд разглядзеў пытанне аб прыняцці заданняў шостай пяцігодкі. У дырэктывах было вызначана, што галоўнай задачай шостай пяцігодкі ў галіне сельскай гаспадаркі з’яўляецца круты ўздым сельскагаспадарчай вытворчасці. Дзеля таго, каб забяспечыць такі ўздым, савецкай краіне патрэбна было за пяць гадоў павялічыць прадукцыйнасць працы ў калгасах прыкладна ў 2 разы [23, с. 117, 156]. К. Мазураву неабходна было павялічыць вытворчасць збожжавых культур у параўнанні з 1955 г. у 2,9 раза, ільновалакна – у 1,4 раза, бульбы – у 1,7 раза, цукровых буракоў – у 6 разоў, мяса – у 1,8 раза, малака – у 2 разы [23, с. 170].

**Спроба спаборніцтва з ЗША на ніве аграрнай вытворчасці.** Пасля ХХ з’езда члены прэзідыума ЦК КПСС разумелі, што павелічэнне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў 2 разы запатрабуе ўзмацнення арганізатарскай працы партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва СССР і ўсіх савецкіх рэспублік. Таму ў мэтах мабілізацыі адміністрацыйна-ўпраўленчага персаналу, працоўных калектываў калгасаў краіны на вырашэнне харчовага пытання вясной 1957 г. пачала “прасоўвацца” новая ініцыятыва. 22 мая 1957 г. у Ленінградзе адбылася нарада работнікаў сельскай гаспадаркі Паўночна-Заходняга рэгіёна РСФСР, на якой выступіў М. Хрушчоў. “Мы дзёрзнулі кінуць выклік Амерыцы ў важнейшай эканамічнай вобласці. Каб дагнаць ЗША па вытворчасці мяса на душу насельніцтва, нам трэба павялічыць яго вытворчасць у 3,2 разы ў параўнанні з 1956 годам… Думаю, калі мы гэта аб’явім, у кожнага з’явіцца жаданне ўступіць у барацьбу, і кожны захоча штосьці зрабіць, каб дапамагчы свайму калгасу, саўгасу, раёну, дапамагчы сваёй вобласці, рэспубліцы, у цэлым краіне і вырашыць гэтую задачу раз і назаўжды”, – абвясціў М. Хрушчоў [24, с. 1].

Даследаванне фактычнага матэрыялу дазволіла ўстанавіць, што ідэя спаборніцтва была выказана старшынёй калгаса імя Камінтэрна Мічурынскага раёна Тамбоўскай вобласці Я. Андрэевай вясной 1957 г. на нарадзе ў Варонежы [25, с. 2]. Пасля 24 мая 1957 г. у СССР разгарнулася шырокая прапагандысцкая кампанія, яе вынікі былі падведзены ў чэрвені 1957 г., калі пленум ЦК КПСС прыйшоў да высновы, што ініцыятыва па спаборніцтве з ЗША сустрэла “падтрымку

і адабрэнне ўсяго савецкага народа” [23, с. 277]. І ўсё ж новыя вытворчыя паказчыкі, якія былі зацверджаны кіраўніцтвам усіх саюзных рэспублік, абласцей, раёнаў, калгасаў і саўгасаў на 1957 г., не былі дасягнуты. Гэтаму перашкодзіла моцная засуха, якая ў 1957 г. ахапіла Ніжняе і Сярэдняе Паволжжа, Паўднёвы Урал і Казахстан.

М. Хрушчоў лічыў, што ў кіраўніцтве сельскай гаспадаркай нельга абапірацца толькі на планавыя дырэктывы, рашэнні з’ездаў і пленумаў ЦК КПСС. У гэтай справе найлепшы вынік дае жывая арганізатарская работа з людзьмі, таму кожны партыйны кіраўнік павінен дасканала ведаць справу, а працоўныя калектывы калгасаў патрэбна “вучыць і натхняць” [26, с. 305.] Кіруючыся прынцыпам “вучыць і натхняць”, 19 студзеня 1958 г. ён прыехаў у Мінск. Дзяржаўныя ўзнагароды, якія ён прывёз перадавікам вытворчасці, павінны былі сялян натхняць. Званне Героя Сацыялістычнай Працы адразу атрымалі 32 чалавекі, а ордэнамі і медалямі была ўзнагароджана вялікая група калгаснікаў – 4970 чалавек [27, с. 1.] Безумоўна, гэты былі заслужаныя ўзнагароды. Да прыкладу, у 1950 г. у калгасе “Перамога” Бабруйскага раёна стала даяркай Аляксандра Рыгораўна Скакун. У 1954 г. ад кожнай з 17 замацаваных за ёю кароў, яна за год надаіла па 1800 кг малака, а ў 1957 – ужо па 5 тыс. кг, за гэты працоўны подзвіг яна была ўшанавана званнем Героя Сацыялістычнай Працы [28, с. 50–55].

Пад час візіту М. Хрушчоў сустракаўся і гутарыў з наватарамі і лідарамі вытворчасці ў калгасах “Новы быт” і імя Гастэлы, затым правёў нараду перадавікоў сельскай гаспадаркі. Рэспубліка была ўсхвалявана шчодрасцю цэнтральнага кіраўніцтва СССР, таму да выступлення М. Хрушчова беларусы ўважліва прыслухоўваліся. У пачатку прамовы ён агучыў паказчыкі па вытворчасці прадукцыі, якія былі атрыманы ў БССР, параўнаў іх з паказчыкамі 1956 г. У 1957 г. у калгасах Беларусі было атрымана на 100 га сельгасугоддзяў мяса ў жывой вазе 16,1 ц, або на 27 % больш, чым у 1956 г., сярэдні ўдой малака ад каровы ў 1954 г. быў 897 кг, а ў 1957 г. – 1575 кг. М. Хрушчоў заўважыў: “Вось вашы паказчыкі. Яны пакуль скромныя” і дадаў: “У вас, таварышы, … мала кароў… На 100 га зямлі ў калгасах прыпадае 6 кароў, а ў калгаснікаў – 12,… у 2 разы больш” [29, с. 508, 511]. У прамове М. Хрушчоў адзначыў, што цэнтральнай праблемай у жывёлагадоўлі з’яўляецца вытворчасць кармоў. Шмат увагі ён надаў кукурузе. “Я гаварыў раней і хачу паўтарыць цяпер: няма іншай культуры, якая так аплочвае працу, як кукуруза… Кукурузу ў Беларусі трэба сеяць... Таварышы, я параіў бы Беларусі сеяць цукровыя буракі… Беларусь павінна ўзяцца за вырошчванне буракоў”, – сказаў М. Хрушчоў [29, с. 512, 517]. Была звернута ўвага і на далейшы лёс машынна-трактарных станцый. “Існуюць два гаспадары на адной зямлі – калгасы і МТС. А там дзе два гаспадары, – не можа быць добрага парадку… Паўстае пытанне, ці не лепш машыны прадаць калгасам,” – сказаў М. Хрушчоў [29, с. 522]. Рашэнне аб продажы было прынята ў лютым 1958 г. і гісторыя МТС завяршылася.

Практычная рэалізацыя новых кірункаў аграрнай палітыкі савецкай дзяржавы станоўча адбілася на выніках гаспадарання. За 1954–1958 гг. валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі СССР павялічвалася ў сярэднегадавым вылічэнні на 8,6 % [3, с. 44], Беларускай ССР – на 6,4 % [4, с. 202]. Гэта быў адзін з самых спрыяльных перыядаў развіцця савецкай вёскі (пры нэпе – 10 %) [5, с. 256]. Вырасла ўраджайнасць збожжавых, асабліва пшаніцы. У 1958 г. ураджайнасць пшаніцы ў СССР склала 16,2 ц/га [7, с. 421], а ў ЗША у 1960 г. яна склала 17,6 ц/га [30, с. 67], у 1958 г. СССР прадаў на знешніх рынках 5,1 млн т зерня [7, с. 420]. Але акрамя станоўчых вынікаў, засталіся і невырашаныя праблемы. У 1959 г. у калгасах і саўгасах БССР на 100 га сельгасугоддзяў утрымлівалася 17,8 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку па 7,1 галавы кароў [22, с. 80], г. зн. запланаваныя паказчыкі (адпаведна 20 і 10 галоў), і не толькі гэтыя, не былі выкананы. У цэлым тэмпы развіцця сельскай гаспадаркі СССР, а таксама і БССР не адпавядалі ідэі крутога ўздыму гэтай галіны, задэклараванаму М. Хрушчовым у верасні 1953 г., не адпавядалі яны і выкліку, кінутаму ЗША.

Безумоўна, калі члены прэзідыума ЦК КПСС абмяркоўвалі вынікі эканамічнага развіцця краіны за 1954–1958 гг., яны, у першую чаргу, звярталі ўвагу на нявырашаныя праблемы. Аднак да 1962 г. яшчэ быў запас часу, былі і пэўныя поспехі. У снежні 1959 г. пленум ЦК КПСС разглядзеў пытанне “Аб далейшым развіцці сельскай гаспадаркі” і адзначыў, што ў 1959 г. у СССР было выраблена 62 млн т малака, а вытворчасць масла смятанкавага склала 4 кг на душу

насельніцтва. Гэтыя паказчыкі перавышалі адпаведныя паказчыкі ЗША, дзе ў 1959 г. вытворчасць масла смятанкавага склала 3,7 кг на душу насельніцтва [18, с. 19]. Таму М. Хрушчоў разлічваў, што ў спаборніцтве з фермерамі ЗША савецкае калгаснае сялянства здолее перамагчы.

На нечарговым XXI з'ездзе КПСС прамова М. Хрушчова была прысвечана "вялікім перамогам савецкага народа", здзейсненым пад яго кіраўніцтвам. Ён паставіў пытанне – у якія тэрміны можна будзе пераадолець адставанне СССР, калі прадукцыйнасць працы ў прамысловасці ЗША вышэй чым у СССР ў 2–2,5 разы, у сельскай гаспадарцы – прыкладна ў 3 разы? Яго адказ быў адназначны – рашаючую ролю адыгрываюць тэмпы развіцця вытворчасці, за сямігодку ў СССР яны ў сярэднегадавым вылічэнні складуць 8,6 %, у ЗША – прыкладна 2 %. "Высокія тэмпы – гэта агульная заканамернасць сацыялізму", – сказаў М. Хрушчоў [31, с. 109]. У сувязі з кінутым раней выклікам ён паўтарыў, што з гэтага моманту кожная партыйная арганізацыя павінна праявіць ініцыятыву дзеля таго, каб пераўзыйсці прадукцыйнасць працы амерыканскіх фермераў [31, с. 133]. Адпаведна заданні рэспублікам былі выданы вельмі напружаныя. Дырэктывы XXI з'езда КПСС, адрасаваныя кіраўніцтву БССР, у 1965 г. прадугледжвалі павелічэнне аб'ёму вытворчасці (у параўнанні з 1958 г.) ільновалакна ў 1,3 раза, бульбы – у 2,1 раза, цукровых буракоў – у 3,2–3,6 раза, збожжа – у 2,3–2,6 раза, мяса і малака – у 1,9–2 раза [31, с. 459]. На гэтым М. Хрушчоў не спыніўся, у 1962 г. яго планы па крутым уздыме сельскагаспадарчай вытворчасці былі прапісаны і ў партыйнай праграме.

**Новыя кірункі аграрнай палітыкі.** У справаздачным дакладзе на XXII з'ездзе КПСС кіраўніцтва ЦК КПСС дэкларавала, што аснову далейшай аграрнай палітыкі складае дасягненне наступнай мэты, а менавіта: арганізацыя магутнага ўздыму вытворчых сіл сельскай гаспадаркі, што дазволіць вырашыць дзве асноўныя, цесна звязаныя паміж сабой задачы: дасягнуць дастатку высокаякаснага харчавання для насельніцтва і сыравіны для прамысловасці [32, с. 76]. Галоўным кірункам палітыкі магутнага ўздыму была задэкларавана электрыфікацыя, усебаковая механізацыя і інтэнсіфікацыя вытворчасці, укараненне навейшых тэхналогій, дасягненняў аграрнай навукі, у тым ліку беларускай, у галіне раслінаводства і жывёлагадоўлі, вытворчасці кармоў і інш. У мэтах умацавання калгасаў дыпламаванымі спецыялістамі, вырашэння сацыяльных пытанняў калгасы былі аб'яўлены "школай камунізму" [32, с. 77] для сялянства. Па разліках кіраўніцтва, калгаснікі за 10-гадовы перыяд навучання ў гэтай "школе" павінны былі ўзброіцца новымі тэхналогіямі, павысіць свой прафесіяналізм і павялічыць агульны аб'ём вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі за 10 гадоў прыкладна ў 2,5 раза, а за 20 гадоў – у 3,5 раза. Прадукцыйнасць працы павінна была вырасці адпаведна у 2,5 і 5–6 разоў [32, с. 78]. Калі больш крытычна ацаніць запраграмаваныя паказчыкі, неабходна адзначыць, што трэцяя праграма КПСС утрымлівала шэраг істотных недахопаў. Па-першае, амаль не пралічваліся і эканамічна не абгрунтоўваліся складаныя эканамічныя пытанні, якія патрабавалася вырашыць "раз і назаўжды". Сельская гаспадарка, да прыкладу, не была нават электрыфіцыравана, яна не была забяспечана кваліфікаванымі кадрамі, калгасы толькі-толькі пачалі самастойна карыстацца машынна-трактарнай тэхнікай, яны не мелі сваёй рамонтнай базы, інжынерна-тэхнічных кадраў. Без уліку гэтых фактараў разлічваць на выкананне праграмных задач па павышэнні прадукцыйнасці працы, дасягненні валавых паказчыкаў па вытворчасці збожжавых культур, малака і мяса было заўчасным. Па-другое, той узровень, на якім у 1961 г. знаходзілася сельгасвытворчасць у СССР, таксама не мог быць абраны ў якасці "пункту адліку" ў вызначэнні перспектыў і паказчыкаў яе далейшага развіцця. Таму што па асноўных вытворчых паказчыках у 1961 г. СССР не ўваходзіў у лік лідараў сусветнай эканомікі.

Па-трэцяе, былі дапушчаны пралікі ў вызначэнні эканамічных прыярытэтаў. Статус эканамічнага прыярытэту у трэцяй праграме КПСС атрымалі прамысловасць і гарадская гаспадарка, а аграрная вытворчасць сюды не ўвайшла. У далейшым гэты пралік аказаў рашаючы ўплыў на развіццё ўсёй савецкай планавай сістэмы гаспадарання. Недахопам трэцяй праграмы КПСС было і іншае. "Праграма КПСС уяўляецца мне нейкім гіганцкім каркасам, накіраваным увысь, узводзячымся велізарным будынкам, пакрытым своеасаблівымі рыштаваннямі, узнімаючыся па якіх з прыступкі на прыступку, працоўныя нашай краіны сваёй працай ствараюць багацці, запаўняюць каркас, узводзяць будынак камунізму", – гаварыў М. Хрушчоў [26, с. 299].

Відавочна, што ў прынятай партыйнай праграме не надавалася неабходнай увагі актывізацыі чалавечага фактара, калгаснаму сялянству было вызначана месца шэраговага будаўніка камунізму. Нагадаю, што ў 1986 г. XXVII з'езд КПСС на аснове асэнсавання гістарычнага вопыту задэкларараваў, што "паспяховае вырашэнне намечаных задач партыя звязвае з павышэннем ролі чалавечага фактара" [33, с. 140]. У 1961 г. гэтага не было зроблена, у выніку трэцяя праграма партыі так і засталася ідэалагічным "каркасам", якую савецкія сяляне не здолелі запоўніць харчовым багаццем.

**Рэарганізацыя сістэмы партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва савецкай эканомікай.** Адзначым, што ў справаздачным дакладзе на XXII з'ездзе аб выніках гаспадарання ў БССР нічога не гаварылася. Таму зусім невыпадкова, што пасля з'езда і прыняцця партыйнай праграмы, М. Хрушчоў зноў вырашыў наведаць Беларусь. 10 студзеня 1962 г. ён прыехаў у Мінск, склікаў нараду. Спачатку ўзялі слова кіраўнікі гаспадарак і спецыялісты. У сваім выступленні звеннявы калгаса "Кастрычнік" Хойніцкага раёна В. Кот заўважыў: "Мікіта Сяргеевіч параіў калгасам і саўгасам па-сапраўднаму заняцца вырошчваннем кукурузы. Ажыццяўляючы гэтыя ўказанні, мы пачалі высяваць кукурузу… З кожнага гектара сабрана 835 ц зялёнай масы з пачаткамі… Пачынаючы з мінулага года сельгасарцель пачала сеяць цукровыя буракі". Начальнік упраўлення Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР, кандыдат сельскагаспадарчых навук С. Цішкоў адзначыў, што "ў Беларусі кукуруза доўгі час была не ў пашане", але пасля нарады 1958 г. у гэтай справе пачаўся "сапраўдны пералом" [34, с. 1, 2].

Пасля старшынь, брыгадзіраў і звеннявых выступіў К. Мазураў. Ён заявіў, што калгасы і саўгасы рэспублікі атрымліваюць "недапушчальна нізкія ўраджаі збожжавых культур, збожжа ўласнай вытворчасці для патрэб жывёлагадоўлі ў калгасах і саўгасах не хапае. Значную частку фуражу яны купляюць у дзяржавы" [35, с. 1], усё гэта негатыўна адбівалася на вытворчасці мясамалочнай прадукцыі. "Гэта вынік безадказнасці кіруючых партыйных і савецкіх органаў рэспублікі, гэта вынік нізкай дысцыпліны і неарганізаванасці, якія мелі месца ў нашай рабоце ў мінулым годзе. Ніякіх іншых тлумачэнняў даць нельга", – падсумаваў К. Мазураў [35, с. 1].

Затым было выступленне М. Хрушчова. На гэты раз ніякіх узнагарод у Беларусь ён не прывёз. "Павінен вам сказаць, што Цэнтральны Камітэт не задаволен становішчам спраў у сельскай гаспадарцы Беларусі. За апошнія тры-чатыры гады калгасы і саўгасы рэспублікі па сутнасці топчуцца на месцы з вытворчасцю сельскагаспадарчых прадуктаў" [26, с. 300–301]. Ён назваў некаторыя лічбы. У адпаведнасці з заданнем сямігодкі ў 1961 г. вытворчасць збожжа ў рэспубліцы павінна была скласці 206 млн пудоў. Фактычна было атрымана 135 млн пудоў (недабор склаў 71 млн пудоў, або 34,4 % планавага задання). Вытворчасць ільну ў 1961 г. павінна была скласці 1 млн 79 тыс. ц, фактычна склала 867 ц (недабор склаў 19,6 %). Незадавальнялі справы і ў жывёлагадоўлі. У 1959 г. у Беларусі было атрымана мяса (у забойнай вазе) 140 тыс. т; у 1960 г. – 148 тыс. т, у 1961 г. – таксама 148 тыс. т. "Вось вынік вашай работы … Тры гады няма руху наперад… За мінулы год у калгасах і саўгасах рэспублікі загінула 516 тыс. свіней, або 15 % усяго пагалоўя, у тым ліку 395 тыс. парасят, або 20 %. Гэта што, таварышы, – нармальная з'ява… Не, гэта – абуральнае вядзенне сельскай гаспадаркі, вынік адсутнасці кармоў, дрэннага дагляду жывёлы", – заключыў М. Хрушчоў [26, с. 301, 306]. Рэзкая крытыка прагучала пад час абмеркавання пытання аб травапольнай сістэме земляробства. "Загрузлі некаторыя вучоныя ў травапольным балоце… За перыяд з 1953 па 1961 г. плошча збожжавых у Беларусі скарацілася на 800 тыс. га. У той жа час пасевы траў павялічыліся з 477 тыс. га да 1 млн 175 тыс. га… Задумайцеся, таварышы, над гэтымі лічбамі! На 800 тыс. га скараціліся плошчы збожжавых ў рэспубліцы! Куды ж вы глядзелі, тав. Мазураў, хто кіруе рэспублікай – Цэнтральны камітэт партыі і Савет Міністраў Беларусі ці травапольшчыкі?... Кіраўнікі Беларускай рэспублікі па сутнасці перасталі займацца вытворчасцю збожжа" [26, с. 324–326]. Пасля гэтай нарады К. Мазураў павінен быў зрабіць адпаведныя высновы адносна вырошчвання ў Беларусі каласавых культур, цукровых буракоў, бульбы, выкаранення травапольных севазваротаў, вытворчасці мяса свініны і інш.

У той жа час матэрыялы шматлікіх абмеркаванняў становішча ў сельскай гаспадарцы засведчылі аб адарванасці старых, прызначаных яшчэ І. Сталіным кадраў, ад патрэб сельскай гаспадаркі. Спрактыкаваныя наменклатуршчыкі ўжо не баяліся рэпрэсій і кіравалі раёнамі

і абласцямі метадам тэлефанаграм і рабочых нарад. У выніку ў 1961 г. краіна не здолела дагнаць ЗША па вытворчасці мяса і малака на душу насельніцтва, што стала прадметам народнага гумару і моцна падрывала аўтарытэт савецкага лідара. Акрамя таго, абапіраючыся на вынікі дзейнасці партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва на працягу 1958–1961 гг., М. Хрушчоў прыйшоў да несуцяшальнай высновы: калі нічога не памяняць у рэспубліканскім, абласным, раённым кіраўніцтве сельскай гаспадаркай, праз 10 год пасля прыняцця трэцяй праграмы КПСС вынік можа быць такім жа правальным.

Гэта падштурхнула савецкага лідара да новай ініцыятывы ў кірунку арганізацыйна-кадравай палітыкі. “Калі стане ясна, што вытворчасць мяса, малака і іншых прадуктаў не расце, то трэба зрабіць выснову адносна такога кіраўніка… Мы павінна аб’явіць бязлітасную барацьбу балбатунам, усякага роду пустазвонам”, – настаўляў М. Хрушчоў партыйнае кіраўніцтва саюзных рэспублік [26, с. 294]. Такая барацьба пачалася ў сакавіку 1962 г., калі адбыўся пленум ЦК КПСС, які разглядзеў пытанне “Сучасны этап камуністычнага будаўніцтва і задачы партыі па паляпшэнні кіраўніцтва сельскай гаспадаркай”. “Пры існуючай сістэме кіраўніцтва мы не робім належнага ўплыву на арганізацыю вытворчасці ў калгасах і саўгасах. Мы звяртаемся з агульнымі заклікамі, збіраем нарады, прымаем часам нядрэнныя рашэнні. А далей што? У нас няма органа, які б забяспечваў выкананне выпрацаваных рашэнняў, і мы абмяжоўваемся тым, што кідаем заклік: наперад, таварышы! А хто і як пайшоў наперад, ці ўсе атрады рушылі, ці ўсё падрыхтавана для вытворчасці неабходнай колькасці прадуктаў? Аб гэтым ніхто не ведае і адказнасці не патрабуе, ды і няма з каго патрабаваць”, – заявіў М. Хрушчоў [26, с. 403].

Пасля гэтага былі выкладзены новыя прапановы, якія тычыліся змен у сістэме кіраўніцтва. М. Хрушчоў сказаў: “Неабходна скончыць з некіруемасцю ў сельскай гаспадарцы, з самацёкам… Прэзідыум ЦК выносіць на абмеркаванне такую прапанову: стварыць у абласцях калгасна-саўгасныя ўпраўленні… Думаю, гэта правільна” [26, с. 409]. У прынятай пастанове было вырашана стварыць у рэспубліках тэрытарыяльныя міжраённыя калгасна-саўгасныя ўпраўленні па кіраўніцтве сельскагаспадарчай вытворчасцю і, пачынаючы з ЦК, партыйныя камітэты па сельскай гаспадарцы. Пасля гэтага летам 1962 г. пачалася паспешлівая праца па рэарганізацыі кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, калі 2–3 раёны аб’ядноўваліся ў адно спецыялізаванае калгасна-саўгаснае вытворчае ўпраўленне. К канцу 1962 г. у БССР было створана 77 такіх упраўленняў. Гэтая рэарганізацыя выклікала пэўную незадаволенасць адміністрацыйна-ўпраўленчага персаналу калгасаў і саўгасаў, яна парушыла існаваўшую сістэму адміністрацыйна-палітычнага раяніравання. Тэрытарыяльна раённыя органы ўлады значна аддаліліся, у новых умовах кіраўніцтву калгасаў і саўгасаў праводзіць нарады, атрымліваць розныя дазволы, узгадняць бягучыя, тыднёвыя і іншыя планы гаспадарчай дзейнасці стала складаней.

У сваю чаргу М. Хрушчоў разумеў, што пасля стварэння калгасна-саўгасных упраўленняў надышоў час вырашыць пытанне аб далейшай рэарганізацыі ўжо партыйных камітэтаў. Для М. Хрушчова гэтае пытанне было вельмі адказным. Калі ранейшыя яго рашэнні тычыліся ў асноўным гаспадарчага боку, то гэтае закранала палітычную складовую партыйнага кіраўніцтва. Чарговы пленум быў скліканы 19 лістапада 1962 г. У прамове М. Хрушчоў выклаў аргументаваную канцэпцыю перабудовы ўсіх партыйных структур. “Цяпер старыя арганізацыйныя структуры ўжо робяцца ў пэўным сэнсе тормазам у справе кіраўніцтва партыі вытворчасцю… Усё гэта параджае кампанейскі характар у партыйным кіраўніцтве”, – сказаў М. Хрушчоў [36, с. 319, 320]. Яго прапанова тычылася падзелу партыйных структур на прамысловыя і сельскагаспадарчыя.

Пасля пленума ў БССР на рэспубліканскім узроўні было створана два адпаведных бюро ЦК рэспублікі: прамысловае і сельскагаспадарчае, у абласцях было створана два абкамы, пачалі працу два абласныя аддзелы народнай асветы, аховы здароў’я, міліцыі, фінансаў, культуры. Колькасць дзяржаўных устаноў павялічылася ў два разы. На нашу думку, рэарганізацыя савецкай сістэмы партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва прамысловасцю і сельскай гаспадаркай на той час з’яўлялася актуальнай і наспелай праблемай. Задачы, якія былі вызначаны трэцяй праграмай КПСС, нельга было вырашыць без павышэння эфектыўнасці палітычнай, эканамічнай, гаспадарчай дзейнасці партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва СССР, усіх савецкіх рэспублік, у тым ліку і БССР, прычым усіх узроўняў.

І ўсё ж аднымі адміністрацыйнымі мерамі карэнным чынам павысіць выніковасць працы сістэмы дзяржаўнага ўпраўлення было немагчыма. Таму зусім заканамерна, што поруч з рэарганізацыяй, у цэнтры ўвагі М. Хрушчова была праблема інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Без вырашэння гэтага наспелага і актуальнага пытання, савецкаму калгасніку надалей спаборнічаць з амерыканскім фермам было вельмі цяжка. У лютым 1964 г. пытанне "Аб інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці на аснове шырокага прымянення ўгнаенняў, развіцця арашэння, комплекснай механізацыі і ўкаранення дасягненняў навукі і перадавога вопыта для хутчэйшага развіцця вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі" [37, с. 388] стала прадметам абмеркавання чарговага пленума ЦК КПСС. Курс на інтэнсіфікацыю быў аб'яўлены генеральнай лініяй партыі ва ўздыме сельскай гаспадаркі. Складовай інтэнсіфікацыі была прызнана далейшая электрыфікацыя, паглебленая спецыялізацыя аграрнай вытворчасці, яе хімізацыя і іншыя кірункі. На жаль, пасля лістапада 1964 г. гэтую праблему брэжнеўскае кіраўніцтва перастала педаліраваць, яно ўзгадала пра яе ў 1981 г., калі было ўжо позна.

Неабходна звярнуць увагу на тое, што курс на інтэнсіфікацыю не з'яўляўся дэкларатыўным. На гэты час БССР валодала значным патэнцыялам аграрнай навукі: у 1965 г. у БССР налічвалася 8 навукова-даследчых інстытутаў, 5 абласных вопытных станцый, 4 вышэйшыя навучальныя ўстановы, дзе працавалі 1385 навуковых супрацоўнікаў, у тым ліку 25 дактароў навук і 266 кандыдатаў навук. Па выніках даследаванняў, якія былі выкананы ў 1962–1964 гг., навукова-даследчыя інстытуты рэкамендавалі да шырокага ўкаранення 80 тэматычных распрацовак па земляробстве, жывёлагадоўлі, эканоміцы і арганізацыі вытворчасці, механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі і іншых напрамках развіцця аграрнай вытворчасці [38, арк. 2].

Калі падсумаваць вынікі аграрнай палітыкі СССР, не цяжка заўважыць, што ў цэлым у БССР адзначаныя рэарганізацыі станоўча адбіліся на выкананні планавых заданняў і развіцці сельскай гаспадаркі. Заўважу, што на гэтым не акцэнтавалася ўвага ні палітычных крытыкаў М. Хрушчова, якія імкнуліся "ачарніць" яго імя і справы, ні беларускіх савецкіх гісторыкаў, для якіх хрушчоўскія справы сталі "фігурай замоўчвання". Але факт застаецца фактам. Амаль усе задачы, вызначаныя сямігодкай кіраўніцтву БССР, былі выкананы. У 1965 г. калгасы і саўгасы рэспублікі атрымалі па 39 ц/га мяса на 100 га ворыва [39, с. 462, 463], 99 % беларускіх калгасаў сталі рэнтабельнымі. За сямігодку валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі калгасаў і саўгасаў павялічылася ў 1,7 раза, у тым ліку ў жывёлагадоўлі – у 2,1 раза [40, с. 5, 21]. І ўсё ж у цэлым паказаць амерыканскаму фермеру знакамітую хрушчоўскую "кузькіну маці" калгаснікі СССР не здолелі. Чаго не скажаш аб амерыканцах, якіх менавіта хрушчоўскі выклік падштурхнуў да маштабнай мадэрнізацыі сваёй сельскай гаспадаркі. Праўда, і высновы наконт асобы і дзейнасці М. Хрушчова ў гады перабудовы, у адрозненні ад 1964 г., былі зроблены іншыя. Па сведчанні члена палітбюро ЦК КПСС, сакратара ЦК КПСС В. Мядзведзева, у камандзе М. Гарбачова М. Хрушчова лічылі "асобай неардынарнай, якая карысталася павагай і папулярнасцю" [41, с. 9].

**Заключэнне.** Такім чынам, вывучэнне і аналіз выкладзенага матэрыялу дазваляюць зрабіць наступныя абагульняючыя высновы. Па-першае, дзяржаўная аграрная палітыка СССР, якая праводзілася на працягу 1953–1961 гг., была скіравана на круты ўздым сельскай гаспадаркі, задавальненне спажывецкага попыту на харчовыя тавары. Яе асаблівасцю было матэрыяльна-тэхнічнае ўмацаванне калгасаў і саўгасаў, ажыццяўленне двух этапаў вытворча-тэхналагічнай спецыялізацыі калгасаў і саўгасаў, укараненне новых форм арганізацыі і стымуліравання працы калгаснага сялянства, заснаваных на гаспадарчым разліку. Па-другое, рэалізацыя вераснёўскага 1953 г. мадэрнізацыйнага праекту ў асноўным адбывалася з апорай на экстэнсіўныя фактары развіцця аграрнай вытворчасці СССР. На рэзкае ўзмацненне тэмпаў эканамічнага развіцця абапіралася кіраўніцтва СССР у спаборніцтве з ЗША у вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі на душу насельніцтва ў 1957–1961 гг., якое Савецкі Саюз прайграў. Па-трэцяе, у перыяд пасля 1962 г. савецкая аграрная палітыка была нацэлена на магутны ўздым сельскай гаспадаркі, поўнае задавальненне спажывецкага попыту на харчовыя тавары і патрэб сялянства. Разам з тым, партыйнае кіраўніцтва савецкай краіны не надало аграрнай вытворчасці статуса дзяржаўнага прыярытэту. У цэлым арганізацыйна-палітычныя, планава-эканамічныя і іншыя мерапрыемствы, якія пасля веранёўскага 1953 г. пленума ЦК КПСС, XXII з'езда КПСС укараняліся ў калгасна-

саўгасную вытворчасць, дазволілі сельскай гаспадарцы БССР выканаць планавыя заданні сямігодкі, што спрыяла яе далейшаму развіццю. Па-чацвёртае, палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва СССР па рэарганізацыі сістэмы ўпраўлення савецкай эканомікай была наспелай, нацэленай на ўзмацненне эфектыўнасці і адказнасці дзяржаўнай улады за стан спраў у эканоміцы.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Материалы XXVI съезда КПСС. – М.: Политиздат, 1981. – 223 с.

2. Мартинкевич, В. С. Социально-экономические проблемы сельского хозяйства Белоруссии на этапе развитого социализма / В. С. Мартинкевич. – Минск: Наука и техника, 1975. – 472 с.

3. Венжер, В. Г. Использование закона стоимости в колхозном производстве / В. Г. Венжер. – М., 1965. – 350 с.

4. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – Т. 5: Беларуская ССР у перыяд стварэння развітога сацыялістычнага грамадства і будаўніцтва камунізму (1945–1974 гг.). – 776 с.

5. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Мінск: Экаперспектыва, 2011. – Т. 6: Беларусь у 1946–2009 гг. – 728 с.

6. История государства и права Белорусской ССР: в 2 т. – Минск: Наука и техника, 1976. – Т. 2: 1937–1975 гг. – 656 с.

7. История социалистической экономики СССР: в 7 т. – М.: Наука, 1980. – Т. 6: Восстановление народного хозяйства СССР. Создание экономики развитого социализма. 1946 – начало 1960-х годов. – 590 с.

8. Касцюк, М. П. Шлях да ісціны: гістарычная навука Беларусі ў канцы XX – пачатку XXI ст. / М. П. Касцюк. – Мінск: Экаперспектыва, 2015. – 252 с.

9. Смехович, Н. В. Восстановление и модернизация сельского хозяйства в БССР (1944–1953 гг.) / Н. В. Смехович // Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі. – Мінск: Беларуская навука, 2010. – С. 368–385.

10. Хрущев, Н. С. Строительство коммунизма в СССР и развитие сельского хозяйства: в 5 т. / Н. С. Хрущев. – М.: Госполитиздат, 1962. – Т. 1: Сентябрь 1953 года – январь 1955 года. – 495 с.

11. Хрущев, Н. С. Строительство коммунизма в СССР и развитие сельского хозяйства: в 5 т. / Н. С. Хрущев. – М.: Госполитиздат, 1962. – Т. 3: Январь 1958 года – май 1959 года. – 544 с.

12. Хрушчоў, М. С. Паспяхова ажыццяўляць рашэнні лютаўскага пленума ЦК КПСС аб інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Даклад на нарадзе кіруючых работнікаў партыйных, савецкіх і сельскагаспадарчых органаў 28 лютага 1964 г. / М. С. Хрушчоў. – Мінск: Беларусь, 1964. – 88 с.

13. Стенограмма заседаний Центральной Комиссии «О мероприятиях по увеличению производства продукции сельского хозяйства БССР от 28.12.1956 г.» // НАРБ. – Ф. 31. Оп. 6. Д. 760.

14. Медведев, В. Ф. Специализация в сельскохозяйственном производстве (на примере Брестской области) / В. Ф. Медведев. – Минск: Госиздат БССР, 1961. – 192 с.

15. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. – Минск, 1986. – Т. 5: 1956–1965. – 598 с.

16. Справки инструкторов и уполномоченных ЦК КПБ // НАРБ. Ф. 4-п. Оп. 46. Д. 776.

17. Копии докладных и информаций, посланных в ЦК КПСС, СМ СССР // НАРБ. Ф. 4-п. Оп. 62. Д. 555.

18. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов. – М., 1972. – Т. 8: 1959–1965. – 567 с.

19. Отчеты обкомов, райкомов по принятым ЦК КПБ решениям // НАРБ. Ф. 4-п. Оп. 46. Д. 812.

20. Малышев, П. А. Критерий эффективности социалистического воспроизводства / П. А. Малышев, И. Г. Шилин. – М.: Мысль, 1973. – 382 с.

21. История Беларуси: вопросы и ответы / сост. Г. Я. Голенченко, В. П. Осмоловского. – Минск, 1993. – 208 с.

22. Народное хозяйство БССР. – Минск, 1963. – 511 с.

23. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1971). – М., 1971. – Т. 7: 1955–1959. – 559 с.

24. «В ближайшее время догнать Соединённые Штаты Америки по производсту мяса, масла и молока на душу населения». Речь товарища Н. С. Хрущева на совещании работников сельского хозяйства областей и автономных республик Северо-Запада РСФСР в городе Ленинграде 22 мая 1957 года // Правда. – 1957. – 24 мая.

25. Виноградов, И. Почин Евгении Ивановны Андреевой / И. Виноградов // Правда. –1957. – 12 мая.

26. Хрущев, Н. С. Строительство коммунизма в СССР и развитие сельского хозяйства / Н. С. Хрущев. – М.: Госполитиздат, 1963. – Т. 6: Октябрь 1961 года – март 1962 года. – 479 с.

27. Указ Прэзідыўма Вярхоўнага Савета СССР "Аб узнагароджванні ордэнамі і медалямі калгаснікаў, работнікаў МТС і саўгасаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі, партыйных, савецкіх і камсамольскіх работнікаў Беларускай ССР" // Звязда. – 1958. – 19 студз.

28. Граховский, С. Тропинка на росе / С. Граховский // Дела их золотом горят. – Минск, 1976. – 448 с.

29. Хрущев, Н. С. Строительство коммунизма в СССР и развитие сельского хозяйства: в 5 т. / Н. С. Хрущев. – М.: Госполитиздат, 1962. – Т. 2: Февраль 1955 года – январь 1958 года. – 534 с.

30. Мировая экономика. – М., 1965. – 307 с.

31. Хрущев, Н. С. О контрольных цифрах развития народного хозяйства на 1959–1965 гг. / Н. С. Хрущев. – М.: Госполитиздат, 1959. – 175 с.

32. Программа Коммунистической партии Советского Союза. Принята XXII съездом КПСС. – М.: Госполитиздат, 1973. – 144 с.

33. Материалы XXVII съезда КПСС. – М.: Политиздат, 1986. – 352 с.

34. Багацці беларускай зямлі – на службу народу // Звязда. – 1962. – 12 студз.

35. "Задачы работнікаў сельскай гаспадаркі Беларусі па выкананню рашэнняў XXII з'езда КПСС аб далейшым развіцці сельскай гаспадаркі". Даклад сакратара ЦК КП Беларусі тав. К. Т. Мазурава на нарадзе работнікаў сельскай гаспадаркі Беларусі 11 студзеня 1962 г. // Звязда. – 1962. – 14 студз.

36. Хрущев, Н. С. Строительство коммунизма в СССР и развитие сельского хозяйства / Н. С. Хрущев. – М.: Госполитиздат, 1963. – Т. 7: Март 1962 года – март 1963 года. – 495 с.

37. Хрущев, Н. С. Строительство коммунизма в СССР и развитие сельского хозяйства / Н. С. Хрущев. – М.: Госполитиздат, 1964. – Т. 8: Май 1963 года – март 1964 года. – 559 с.

38. Отчет об основных итогах научно-исследовательских работ па сельскому хозяйству // НАРБ. Ф. 48. Оп. 9. Д. 6663.

39. Экономика Советской Белоруссии. 1917–1967. – Минск: Наука и техника, 1976. – 542 с.

40. Машэраў, П. М. Справаздача Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі XXVI з'езду / П. М. Машэраў. – Мінск: Беларусь, 1966. – 72 с.

41. Медведев, В. В команде Горбачева. Взгляд изнутри / В. Медведев. – М.: Былина, 1994. – 240 с.

## References

1. *Materials XXVI Congress of the CPSU*. Moscow, Politizdat Publ., 1981. – 223 p. (in Russian).

2. Martinkevich V. S. *Social-economic problems of the Byelorussian agriculture at the stage of developed socialism*. Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1975. 472 p. (in Russian).

3. Venzher V. G. *Use of the value law in the collective farm production*. Moscow, 1965. 350 p. (in Russian).

4. *History of the Byelorussian SSR:* Vol. 5: *Byelorussian SSR during the period of the creation of a developed socialist society and the building communism.* Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1975. 776 p. (in Belarussian).

5. *History of Byelorussia.* Vol. 6: *Belarus in 1946–2009.* Minsk, Ekaperspektyva Publ., 2011. 728 p. (in Belarussian).

6. *History of the state and the rights of the Byelorussian SSR*. Vol. 2: *1937–1975*. Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1976. 656 p. (in Russian).

7. *History of the USSR socialist economy.* Vol. 6: *Restoration of the USSR national economy. The creation of developed socialist economy. 1946 – in the early 1960 ies.* Moscow, Nauka Publ., 1980. 590 p. (in Russian).

8. Kastsiuk M. P. *The way to the truth:* ***historical science of Byelorussia at the end of XX – at the beginning of XXI centu****ries.* Minsk, Ekaperspektyva Publ., 2015. 252 p. (in Belarussian).

9. Smekhovich N. V. Agriculture restoration and modernization in the BSSR (1944–1953). *Vosen' 1939 goda u gistarychnym lese Belarusi* [Autumn of 1939 in the historical destiny of Byelorussia]. Minsk, Beluraskaya navuka, 2010, pp. 368–385 (in Russian).

10. Khrushchev N. S. *Building communism in the USSR and developing agriculture*. Vol. 1: *September 1953 – January 1955.* Moscow, Gospolitizdat Publ., 1962. 495 p. (in Russian).

11. Khrushchev N. S. *Building communism in the USSR and developing agriculture development.* Vol. 3: *January 1958 – May 1959.* Moscow, Gospolitizdat Publ., 1962. 544 p. (in Russian).

12. Khrushchou M. S. *Successful* ***implementation of the CPSU CC February Plenum decision about the agriculture in****tensification. The report delivered at the meeting of the leaders of Party, soviet, and agriculture organizations on 28 February 1964.* Minsk, Belarus', 1964. 88 p. (in Belarussian).

13. Shorthand record of the Central Commission meeting "Measures to increase the production of agricultural products in the BSSR on 28.12.1956." *Natsional'nyi arkhiv Respubliki Belarus'* [The National Archives of the Republic of Belarus], fund 31, list 6, file 760. (in Russian).

14. Medvedev V. F. *Specialization in the production of agricultural products (by the example of the Brest region).* Minsk, State Publishing House of the BSSR, 1961. 192 p. (in Russian).

15. *Communist Party of Byelorussia in the resolutions and decisions of Central Committee Congresses and Plenums.* Vol. 5: *1956–1965*. Minsk, 1986. 598 p. (in Russian).

16. Information of instructors and authorized representatives of the CC CPB. *Natsional'nyi arkhiv Respubliki Belarus'* [The National Archives of the Republic of Belarus], fund 4-п, list 46, file 776 (in Russian).

17. Report and information copies sent to the CC CPSU, the CM USSR. *Natsional'nyi arkhiv Respubliki Belarus'* [The National Archives of the Republic of Belarus], fund 4-п, list 62, file 555 (in Russian).

18. *Communist Party of the Soviet Union in the Congress resolutions and decisions.* Vol. 8: *1959–1965*. Moscow, 1972. 567 p. (in Russian).

19. Reports of regional and district committees on the CC CPB decisions. *Natsional'nyi arkhiv Respubliki Belarus'* [The National Archives of the Republic of Belarus], fund 4-п, list 46, file 812 (in Russian).

20. Malyshev P. A., Shilin I. G. *Efficiency criterion of the Socialist reproduction*. Moscow, Mysl' Publ., 1973. 382 p. (in Russian).

21. Golenchenko G. Ia., Osmolovskii V. P. (eds.) *History of Belarus: questions and answers*. Minsk, Belarus' Publ., 1993. 208 p. (in Russian).

22. *National Economy of the BSSR*. Minsk, 1963. 511 p. (in Russian).

23. *Communist Party of the Soviet Union in the resolutions and decisions of CC congresses, conferences, and plenums (1898–1971).* Vol. 7: *1955–1959.* Moscow, 1971. 559 p. (in Russian).

24. "…..in the nearest future, to catch up with the United States of America on meal, oil, and milk production per capita". Comrade N. S. Khrushchev's speech at the meeting of agricultural workers of the regions and the Autonomous Republics of the North-West of the RSFST in the city of Leningrad on 22 May 1957. *Pravda*, 1957, May 24 (in Russian).

25. Vinogradov I. Eugenia Ivanovna Andreeva's initiative. *Pravda*, 1957, May 12 (in Russian).

26. Khrushchev N. S. *Building communism in the USSR and developing agriculture.* Vol. 6: *October 1961 – March 1962.* Moscow, Gospolitizdat Publ., 1963. 479 p. (in Russian).

27. Decree of the USSR Supreme Council Presidium "On rewarding collective farmers, MTS workers, joint collective farms, agricultural specialists, as well as Party, Soviet and Komsomol workers of the Byelorussian SSR with orders and medals". *Zvyazda*, 1958, January 19 (in Belarussian).

28. Grakhovskii S. A path on the dew. *Dela ikh zolotom goriat* [Their affairs are glowing with gold]. Minsk, 1976. 448 p. (in Russian).

29. Khrushchev N. S. *Building communism in the USSR and developing agriculture.* Vol. 2: *February 1955 – January 1958.* Moscow, Gospolitizdat Publ., 1962. 534 p. (in Russian).

30. *World economy.* Moscow, 1965. 307 p. (in Russian).

31. Khrushchev N. S. *Control figures of the national economy development for 1959–1965 years.* Moscow, Gospolitizdat Publ., 1959. 175 p. (in Russian.)

32. *CPSU Program. Accepted by the XXII Congress of the CPSU.* Moscow, Gospolitizdat Publ., 1973. 144 p. (in Russian).

33. *Materials XXVII Congress of the CPSU.* Moscow, Politizdat Publ., 1986. 352 p. (in Russian).

34. The wealth of the Belarusian land – to the people. *Zvyazda*, 1962, January 12 (in Belarussian).

35. "Tasks of the agricultural workers of Belarus on the implementation of the CPSU XXII Congress decisions on a further agriculture development." CC CPB Secretary K. T. Mazurov's report at the meeting of agricultural workers of Byelorussia on 11 January 1962. *Zvyazda*, 1962, January 14 (in Belarussian).

36. Khrushchev N. S. *Building communism in the USSR and developing agriculture.* Vol. 7: *March 1962 – March 1963.* Moscow, Gospolitizdat Publ., 1963. 495 p. (in Russian).

37. Khrushchev N. S. *Building communism in the USSR and developing agriculture.* Vol. 8: *May 1963 – March 1964.* Moscow, Gospolitizdat Publ., 1964. 559 p. (in Russian.)

38. Report on the main outcomes of agriculture research. *Natsional'nyi arkhiv Respubliki Belarus'* [The National Archives of the Republic of Belarus], fund 48, list 9, file 6663 (in Russian).

39. *Economy of Soviet Belarus. 1917–1967.* Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1976. 542 p. (in Russian).

40. Masherau P. M. *CC CPB report to the XXVI Congress.* Minsk, Belarus' Publ., 1966. 72 p. (in Belarussian).

41. Medvedev V. *In Gorbachev's team. View from inside.* Moscow, Bylina Publ., 1994. 240 p. (in Russian).

## Информация об авторах

*Смехович Николай Владимирович* – канд. ист. наук, заведующий центром, Институт истории НАН Беларуси (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: smenic18@mail.ru.

## Для цитирования

Смехович, Н. В. Основные направления аграрной политики СССР 1953–1964 гг. и результаты ее выполнения в БССР / Н. В. Смехович // Докл. Нац. акад. наук Беларуси. – 2017. – Т. 61, № 2. – С. 92–104.

## Information about the authors

*Smiakhovich Nikolai Vladimirovich* – Ph. D. (History), Head of the Department, Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus (1, Akademicheskaya Str., 220072, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: smenic18@mail.ru.

## For citation

Smiakhovich M. U. Main directions of the USSR agricultural policy during 1953–1964 years and the results of their implementation in the BSSR. *Doklady Natsional'noi akademii nauk Belarusi* [Doklady of the National Academy of Sciences of Belarus], 2017, vol. 61, no. 2, pp. 92–104 (in Belorussian).